www.gazeta.bsu.by

# УНІВЕРСІТЭТ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта 18 мая 2007 года, № 9 (1960)

ПАДЗЕІ

## ОРДЭН ЗА СЯБРОЎСТВА

**Беларускі дзяржаўны універсітэт ганараваны адной з вышэйшых дзяржаўных узнагарод Сацыялістычнай Рэспублікі В'етнам — ордэнам Дружбы народаў за значны ўнёсак у падрыхтоўку спецыялістаў для гэтай краіны.**

23 красавіка на ўрачыстым пасяджэнні Вучонага савета Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол СРВ у Беларусі Ву Суан Нінь уручыў ордэн Дружбы народаў рэктару БДУ прафесару Васілю Стражаву і перадаў словы шчырай падзякі ад кіраўніцтва сваёй дзяржавы. Пасля ён цёпла распавёў пра шматгадовае плённае супрацоўніцтва. Напрыканцы цырымоніі быў арганізаваны імправізаваны канцэрт в'етнамскіх студэнтаў, якія навучаюцца ў беларускіх ВНУ.

Падрыхтоўка в'етнамскіх спецыялістаў вядзецца ў БДУ з пачатку 1960-х гг. па розных спецыяльнасцях за кошт Міністэрства адукацыі і падрыхтоўкі кадраў (МАіПК) СРВ, а таксама па індывідуальных кантрактах. За гэты час БДУ выпусціў болей за 500 фізікаў, хімікаў, матэматыкаў і біёлагаў і каля 200 гісторыкаў і журналістаў, філолагаў, філосафаў і юрыстаў. Сёння ва універсітэце навучаецца 30 грамадзян В'етнама.

Партнёрства з В'етнамам пачало актыўна развівацца з 2004 г., калі Беларусь наведала афіцыйная дэлегацыя СРВ і была падпісана дамова паміж МАіПК В'етнама і Белдзяржуніверсітэтам аб наборы в'етнамскіх грамадзян на падрыхтоўчы факультэт БДУ з мэтаю вывучэння рускай мовы і далейшага навучання на асноўных факультэтах. У лютым 2005 г. паміж БДУ і Універсітэтам г. Хьюэ была падпісана Дамова аб супрацоўніцтве, якая прадугледжвае сумесную падрыхтоўку спецыялістаў па схеме "2+3" (два гады навучання ва Універсітэце г. Хьюэ па праграмах фізічнага факультэта і факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі БДУ, затым – тры гады ў Белдзяржуніверсітэце). З 2006 г. па гэтай праграме навучаюцца 20 студэнтаў і аспірантаў Хьюэскага універсітэта. Тую ж колькасць плануецца прымаць у БДУ на працягу 4-х гадоў.

**Яўген ПЕРЛІН**
**Фота Аляксандра СНАПКА**



*Рэктар БДУ прафесар Васіль Стражаў атрымоўвае дзяржаўныя ўзнагароды Сацыялістычнай Рэспублікі В'етнам з рук пасла*

СУПРАЦОЎНІЦТВА

## АДУКАЦЫЯ БЕЗ МЕЖАЎ

**18–20 красавіка ў Мінску прайшла сустрэча-канферэнцыя былых выпускнікоў беларускіх ВНУ з ліку замежных грамадзян "Адукацыя без межаў" пад ініцыятывай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.**



*Міністр адукацыі Беларусі Аляксандр Радзькоў (другі справа) падчас размовы з замежнымі гасцямі БДУ*

Гэтае мерапрыемства выклікала надзвычайную цікавасць у запрошаных – у Мінск з'ехаліся каля 40 замежнікаў з 18-ці краін. Прыбыўшыя шматлікія госці наведалі шэраг сталічных ВНУ, але асноўныя падзеі, у тым ліку сама канферэнцыя і выстава-прэзентацыя адукацыйных паслуг, прайшлі ў Беларускім дзяржаўным універсітэце.

Бадай усе ўдзельнікі сёння займаюць высокія пасады на сваёй радзіме. Прыемна адзначыць, што сярод іх і былы выпускнік БДУ – пасол Йемена ў Расійскай Федэрацыі – Абдульвахаб Мохамед Алі аль-Раўхані. З беларускага боку ў сустрэчы прынялі ўдзел намеснік прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь Аляксандр Косінец, міністр адукацыі Аляксандр Радзькоў, намеснік міністра замежных спраў Віктар Гайсёнак, а таксама кіраўнікі беларускіх ВНУ. Акрамя афіцыйнай часткі, для гасцей была падрыхтавана вельмі насычаная культурная праграма.

Асноўнай мэтай сустрэчы-канферэнцыі стала аб'яднанне замежных выпускнікоў, папулярызацыя айчынных адукацыйных паслуг на міжнародным узроўні, развіццё і ўмацаванне адукацыйных кантактаў. У выніку была прынятая Рэзалюцыя, адным з пунктаў якой з'яўляецца рашэнне аб стварэнні Міжнароднай асацыяцыі выпускнікоў беларускіх ВНУ.

**Дзмітрый ЖАРЫН**
**Фота Сяргея СТРАЛКОЎСКАГА**

УШАНАВАННЕ

## КОНКУРС НАВУКОВЫХ РАБОТ

Дыпломы Міністэрства адукацыі Беларусі ўручылі 11 мая пераможцам Рэспубліканскага конкурсу навуковых работ студэнтаў ВНУ 2006 года. Цырымонія прайшла ў зале пасяджэнняў Вучонага савета БДУ.

У гэтым конкурсе ўдзельнічалі 3070 леташніх студэнтаў, магістрантаў і выпускнікоў з 52-х ВНУ краіны. Лаўрэатамі сталі 63 прадстаўнікі з 26-ці ВНУ, якія здзейснілі значныя навуковыя даследаванні па 29-ці напрамках. Сярод іх – 6 маладых талентаў з БДУ: Вольга Зуева, Аляксандра Карабко, Павел Мацэвіч, Андрэй Пятліцкі, Настасся Траскевіч.

Студэнтаў павіншавалі прарэктар БДУ па навуковай рабоце прафесар Уладзімір Панькоў і начальнік упраўлення навукі і інавацыйнай дзейнасці Міністэрства адукацыі Беларусі Алег Рэвут.

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

ВЫСТАВЫ

## ДЫПЛОМЫ – ЗА ВЫСТАВУ, "ЛІТАРУ" – ЗА ПАРТНЁРСТВА

З 2 па 5 мая ў НВЦ "БелЭкспа", што ў Мінску, праходзіла XI Міжнародная спецыялізаваная выстава "СМІ ў Беларусі". На ёй Беларускі дзяржаўны універсітэт быў прадстаўлены двума стэндамі – факультэта журналістыкі і СМІ БДУ (газеты "Універсітэт" і "Студенческий городок", а таксама часопісы "Веснік БДУ" і "Социология"), – якія карысталіся вялікай папулярнасцю ў наведвальнікаў. Менавіта з журфака ў свой час пачыналася прафесійнае жыццё большасці супрацоўнікаў газет, радыёстанцый і тэлеканалаў краіны. Сюды падыходзіла шмат дзеючых журналістаў, якія распытвалі пра сённяшняе жыццё факультэта, любімых выкладчыкаў. Былыя студэнты з задавальненнем знаходзілі свае прозвішчы ў юбілейным выданні. Мнагалюднымі таксама былі прэзентацыі студэнцкай газеты "Пёры" журфака, падчас якой гучалі вершы, музыка, і відэастудыі Студгарадка "SVS". У выніку факультэт журналістыкі быў узнагароджаны дыпломам "За паспяховы дэбют", а СМІ БДУ атрымалі дыплом "За шырокамаштабнасць экспазіцыі і папулярызацыю вышэйшай адукацыі ў рамках выставы".



*Дэкан факультэта журналістыкі Сяргей Дубовік з прызамі за перамогу ў конкурсе*

Акрамя таго, газета "Універсітэт" стала адным з трох намінантаў III Нацыянальнага конкурсу друкаваных СМІ "Залатая літара", арганізаванага Міністэрствам інфармацыі ў намінацыі "Шматтыражная прэса". А факультэт журналістыкі быў аб'яўлены пераможцай у спецыяльна заснаванай намінацыі "Партнёрства".

**Дзмітрый ГОРСКІ**
**Фота Аляксандра ЗАПОЛЬСКАГА**

## СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

### БДУ Ў ЛІЧБАХ: ДЫНАМІКА РОСТУ

Са справаздачы Галоўнага ўпраўлення эканомікі аб выніках фінансава-гаспадарчай дзейнасці комплексу БДУ за 2006 год

Стар. 2

### МАЛАДЗЁЖНЫЯ ГРАНІ КІНО

Аб выніках фестывалю студэнцкіх відэаролікаў "Кінаграньˮ–2007"

Стар. 3

## ВЕСТКІ З РЭКТАРАТА

РЭКТАР БДУ, старшыня Савета па супрацоўніцтве ў сферы адукацыі дзяржаў – удзельніц СНД прафесар Васіль Стражаў прыняў удзел у XIX пасяджэнні гэтага Савета і ў XII канферэнцыі міністраў адукацыі краін Садружнасці, якія адбыліся 3–4 мая ў сталіцы Таджыкістана Душанбэ.

ПАГАДНЕННЕ аб супрацоўніцтве паміж БДУ і Таджыкскім дзяржаўным нацыянальным універсітэтам падпісалі ў Душанбэ кіраўнікі гэтых ВНУ Васіль Стражаў і Саідмухамад Адынаеў.

ВАСІЛЬ СТРАЖАЎ абраны віцэ-прэзідэнтам Еўразійскай асацыяцыі універсітэтаў, а студэнтка IV курса механіка-матэматычнага факультэта, якая з'яўляецца старшынёй Студэнцкага саюза БДУ, Настасся Гвардзіян – у Савет гэтай арганізацыі.

УРАЧЫСТАСЦІ, прымеркаваныя да Дня Перамогі, прайшлі ў БДУ 7 мая. На свята былі запрошаны ветэраны Вялікай Айчыннай вайны, курсанты ваеннага факультэта, студэнты і супрацоўнікі універсітэта.

ПРАРЭКТАР па навуцы Уладзімір Панькоў падчас рабочага візіту ў Аб'яднаныя Арабскія Эміраты правёў перамовы з Ханіфам Хасанам аль-Касімам – міністрам адукацыі і выхавання ААЭ, рэктарам Універсітэта горада Аль-Аін. Былі абмеркаваны практычныя пытанні па рэалізацыі пагаднення аб супрацоўніцтве абедзвюх ВНУ.

ЗАВЕРШАНА будаванне маналітнага каркаса будынка навучальнага корпуса БДУ на Прывакзальнай плошчы. Пачаліся фасадныя, сантэхнічныя і электратэхнічныя работы, а таксама шкляненне, якое будзе ажыццяўляцца ўлетку.

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

### ПАСЯДЖЭННЕ ВУЧОНАГА САВЕТА БДУ

Выкананне праграм перспектыўнага развіцця БДУ на юрыдычным факультэце будзе разгледжана 21 мая. З дакладам выступіць дэкан юрфака Сяргей Балашэнка. Пачатак мерапрыемства ў 10.15 у зале пасяджэнняў Вучонага савета.

УНІВЕРСІТЭТ

18 мая 2007 года, № 9 (1960)

З ПЕРШЫХ КРЫНІЦ

# БДУ Ў ЛІЧБАХ: ДЫНАМІКА РОСТУ

## ВЫНІКІ ФІНАНСАВА-ГАСПАДАРЧАЙ ДЗЕЙНАСЦІ КОМПЛЕКСУ БДУ ЗА 2006 ГОД

## СА СПРАВАЗДАЧЫ ГАЛОЎНАГА ЎПРАЎЛЕННЯ ЭКАНОМІКІ НА ПАСЯДЖЭННІ ВУЧОНАГА САВЕТА 23 КРАСАВІКА

БДУ з'яўляецца адзіным комплексам, у склад якога ўваходзяць адукацыйныя, навукова-даследчыя, вытворчыя, сацыяльна-культурныя, адміністратыўна-гаспадарчыя і іншыя структурныя падраздзяленні.

На сёння ў комплекс БДУ ўваходзяць 34 установы, прадпрыемствы з правам юрыдычнай асобы, з якіх 15 з'яўляюцца бюджэтнымі, 19 – гаспадарча-разліковымі. Статус юрыдычнай асобы маюць 12 вучэбна-адукацыйных і 8 навукова-даследчых установ, 13 унітарных прадпрыемстваў, а таксама Дырэкцыя будуемых аб'ектаў.

На балансе БДУ па стане на 1 студзеня 2007 г. знаходзілася 112 будынкаў і збудаванняў, балансавы кошт якіх склаў 147,8 млрд рублёў. Агульная плошча будынкаў і збудаванняў складае 355 485 м².

Для абслугоўвання існуючых будынкаў і тых, якія яшчэ будуюцца, размяшчэння вучэбных і спартыўна-аздараўленчых баз універсітэту аддадзены ў пастаяннае карыстанне 45 зямельных участкаў агульнай плошчай 175,36 га, у тым ліку ў Мінску – 36 участкаў агульнай плошчай 44, 63 га.

Установам і прадпрыемствам з правам юрыдычнай асобы, паводле загадаў па БДУ, перададзены ў бязвыплатнае карыстанне памяшканні агульнай плошчай 57,6 тыс. м² (17,6 % ад агульнай плошчы універсітэцкіх будынкаў). На пачатак 2007 г. 13 юрыдычных асоб мелі запазычанасць па аплаце камунальных паслуг і эксплуатацыйных выдаткі за мінулы год на агульную суму звыш 700 млн рублёў.

Паводле заключаных дамоў на 1 студзеня 2006 года ў арэнду здадзена 6448 м² плошчы будынкаў БДУ (1,98 % ад агульнай плошчы). Грашовыя паступленні ў БДУ ад арэнднай платы ў 2006 г. склалі 716,5 млн рублёў.

### КОЛЬКАСНЫ САСТАЎ СУПРАЦОЎНІКАЎ КОМПЛЕКСУ БДУ

У структуры комплексу БДУ за справаздачны перыяд працавалі 8844 чалавекі, у тым ліку 1173 знешніх сумяшчальнікаў. Непасрэдна ва універсітэце працавалі 6679 чалавек, у тым ліку на бюджэтнай аснове – 5529, пазабюджэтнай – 1150.

У агульнай структуры комплексу БДУ на 1 студзеня 2006 г. прафесарска-выкладчыцкі састаў налічваў 2920 чалавек (разам са знешнімі сумяшчальнікамі), у тым ліку непасрэдна па БДУ – 2452 (колькасць адзінак згодна са штатным раскладам – 2249 чалавек).

Агульная колькасць навуковых супрацоўнікаў па комплексе БДУ склала 871 чалавек (разам са знешнімі сумяшчальнікамі), у тым ліку непасрэдна па БДУ – 375 (колькасць адзінак згодна са штатным раскладам – 266 чалавек).

Колькасць вучэбна-дапаможнага персаналу комплексу БДУ склала 1198 чалавек, у тым ліку непасрэдна па БДУ – 825 чалавек.

Штатная колькасць іншага персаналу ў цэлым скарацілася на 68 адзінак. Павялічылася на 25 адзінак колькасць апарату кіравання, якія ўтрымліваецца за кошт пазабюджэтнай дзейнасці БДУ і РІВШ.

Непасрэдна ў БДУ ў 2006 г. згодна са штатным раскладам утрымлівалася 5342,25 штатных адзінак, у тым ліку за кошт бюджэту – 4343,25, паза бюджэтам – 999,0.

### АДУКАЦЫЙНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ

У 2006 г. сярэднегадавы кантынгент навучэнцаў па комплексе БДУ склаў 32 086 чалавек (гл. табл.1). Прырост к 2005 г. склаў 7,7 %.

*Табліца 1. Сярэднегадавы кантынгент навучэнцаў па комплексе БДУ ў 2005–2006 гг.*

| № п/п | Катэгорыя | Комплекс БДУ | | бюджэт | | пазабюджэт | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | 2005 | 2006 | 2005 | 2006 | 2005 | 2006 |
| 1. | Студэнты | 19 911 | 21 570 | 11 670 | 11 620 | 8 241 | 9 950 |
| 2. | Магістры | 555 | 534 | 220 | 220 | 335 | 314 |
| 3. | Аспіранты | 785 | 767 | 771 | 739 | 14 | 28 |
| 4. | Дактаранты | 16 | 19 | 16 | 19 | - | - |
| 5. | Слухачы курсаў павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў | 3 651 | 3 658 | 324 | 324 | 3 327 | 3 334 |
| 6. | Навучэнцы | 4 874 | 5 538 | 1 280 | 1 229 | 3 594 | 4 309 |
| | **Усяго** | **29 792** | **32 086** | **14 281** | **14 151** | **15 511** | **17 935** |

На 1 студзеня 2007 г. колькасць студэнтаў па комплексе БДУ за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту склала 11945 чалавек, у тым ліку на дзённай форме навучання – 9444 чалавекі, завочнай – 2501 чалавек.

Суадносіны колькасці навучэнцаў (па ўсіх катэгорыях) на платнай аснове і за кошт бюджэтных сродкаў у 2006 г. па комплексе БДУ паказана на дыяграме 1.

*Дыяграма 1. Доля навучэнцаў комплексу БДУ за кошт бюджэтных сродкаў і на платнай аснове ў 2006 годзе*




У 2006 г. колькасць студэнтаў, якія атрымлівалі стыпендыю, склала 8676 чалавек (93,5 % ад навучэнцаў дзённай формы).

Працэнт паспяховасці ў сярэднім за 2006 г. склаў 91,4 (прырост к 2005 г. – 1,4 %).

Сума выплачаных надбавак за поспехі ў вучобе і навуковай рабоце, аказанне матэрыяльнай дапамогі за 2006 г. склаў 1 026 млн рублёў.

### СЯРЭДНЯЯ ЗАРАБОТНАЯ ПЛАТА ПА БДУ

Сярэдняя заработная плата супрацоўнікаў БДУ ў 2006 г. склала 749,7 тыс. рублёў, у тым ліку прафесарска-выкладчыцкага саставу (ПВС) – 985,3 тыс. рублёў.

Узровень аплаты працы работнікаў БДУ перавысіў узровень аплаты працы работнікаў народнай гаспадаркі ў цэлым на 26,9 %, прамысловасці – на 15,9 %, галіны адукацыі – на 53,5 %.

Сярэдняя зарплата ПВС у БДУ вышэйшая за астатнія ВНУ на 9,3 % (адпаведна – 985.3 тыс. рублёў і 901,8 тыс. рублёў). За апошнія два гады заработная плата работнікаў БДУ ўзрасла ў 1,5 разы.

### ДАХОДЫ КОМПЛЕКСУ БДУ

Агульны аб'ём даходаў у 2006 г. склаў 213,47 млрд рублёў.

Удзельная вага сродкаў ад пазабюджэтнай дзейнасці ў бюджэтным фінансаванні склала 37,4 % (у 2005 г. – 31,7 %).

Асноўныя крыніцы даходаў комплексу БДУ ў 2006 г.:

- грашовыя сродкі рэспубліканскага бюджэту – 110 370,5 млн рублёў;
- сродкі ад пазабюджэтнай дзейнасці – 37 518,4 млн рублёў;
- выручка ад фінансава-гаспадарчай дзейнасці гаспадарча-разліковых арганізацый комплексу БДУ – 38 600,4 млн рублёў;
- сродкі, атрыманыя па дамовах з галоўнымі выканаўцамі рэспубліканскіх НТП і асобных праектаў, якія фінансуюцца з рэспубліканскага бюджэту, – 12 675,2 млн рублёў;
- крэдыты – 10 533,2 млн рублёў;
- выкананы аб'ём працы па НДР за кошт сродкаў заказчыка – 3 773, 47 млрд рублёў.

Колькасць студэнтаў і магістрантаў БДУ, якія навучаюцца на платнай аснове ў 2006 г., склала 8005 чалавек (прырост к 2005 г. – 32,2 %). Па адукацыйных паслугах атрымана даходаў 19 368,7 млн рублёў (прырост – 30 %).

У 2006 г. за навучанне на кантрактнай аснове ад 429-ці замежных грамадзян было атрымана 641,2 тыс. долараў ЗША (прырост – 29,4 %).

Выручка ад пазабюджэтнай і фінансава-гаспадарчай дзейнасці юрыдычных асоб і філіялаў БДУ па выніках 2006 г. склала 37,51 млрд рублёў (прырост к 2005 г. – 35,76 %).

Даходы комплексу БДУ па катэгорыях структурных падраздзяленняў адлюстраваны на дыяграме 2 і ў табліцы 2.

### ВЫДАТКІ КОМПЛЕКСУ БДУ

Агульныя фактычныя выдаткі бюджэтных прызначэнняў па БДУ і структурных падраздзяленнях склалі 123 948,3 млн рублёў (прырост к 2005 г. – 35,8 %). У агульнай структуры выдаткаў бюджэтных прызначэнняў комплексу БДУ выдаткі на арганізацыю навучальнага працэсу склалі 90 248,2 млн рублёў (72,8 % ад агульных выдаткаў), навукова-даследчую работу – 12 368,8 млн рублёў (10 %), капітальнае будаўніцтва – 21 331,8 млн рублёў (17,2 %). У цэлым у структуры выдаткаў па комплексе БДУ ў 2006 г. павялічыліся выдаткі на заработную плату і налічэнні на яе на 6 %. Доля капітальнага рамонту склала 15 % (у 2005 г. – 12,1 %).

На непасрэднае ўтрыманне БДУ ў 2006 г. з рэспубліканскага бюджэту выдзелена 72,0 млрд рублёў (95 % ад зацверджанага плана). Найбольшую ўдзельную вагу ў агульным аб'ёме фінансавання займаюць выдаткі на заработную плату з налічэннямі на яе – 44,4 млрд рублёў (61,6 %), выплату стыпендый – 16,5 млрд рублёў (22,9 %), капітальны рамонт – 3,6 млрд рублёў (5 %), аплату камунальных паслуг – 3,45 млрд рублёў (4,8 %). Фактычныя выдаткі бюджэтных прызначэнняў БДУ па артыкулах выдаткаў склалі 80,8 млрд рублёў.

Выдаткі пазабюджэтных сродкаў бюджэтнымі арганізацыямі комплексу БДУ ў 2005 г. склалі 30,12 млрд рублёў, у тым ліку:

- заработная плата працоўных і служачых і налічэнні на зарплату – 13,45 млрд рублёў;
- капітальныя выдаткі ў тым ліку капітальны рамонт – 6,97 млрд рублёў;
- набыццё прадметаў забеспячэння і выдаткаваных матэрыялаў – 2,99 млрд рублёў;
- іншыя бягучыя выдаткі на набыццё тавараў і аплату паслуг – 5,50 млрд рублёў.

*Дыяграма 2. Даходы комплексу БДУ ў разрэзе структурных падраздзяленняў*




*Табліца 2. Звесткі аб выручцы ад пазабюджэтнай і фінансава-гаспадарчай дзейнасці структурных падраздзяленняў БДУ (у млн рублёў)*

| Найменне структурнага падраздзялення | Сума |
|---|---|
| Комплекс БДУ: | 79 892,4 |
| БДУ (вучэбныя ўстановы і Дырэкцыя будуемых аб'ектаў): платнае і кантрактнае навучанне, арэнда памяшканняў, паслугі спартыўна-аздараўленчага характару, аўтагаспадарка і інш. | 37 518,4 |
| НДІ (гаспадарчыя дамовы) | 3 773,6 |
| Вучэбна-адукацыйныя ўстановы | 7 390,7 |
| Унітарныя прадпрыемствы | 27 814,2 |
| Прадпрыемствы, створаныя з удзелам БДУ | - |
| Філіялы БДУ | 3 395,5 |

### ФІНАНСАВА-ГАСПАДАРЧАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ ГАСПАДАРЧА-РАЗЛІКОВЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ КОМПЛЕКСУ БДУ

Сярэднестатыстычная колькасць працоўных у 22-х гаспадарча-разліковых арганізацыях і філіялах БДУ склала 926 чалавек. Выручка ад рэалізацыі прадукцыі, тавараў і паслуг у 2006 г. склала 38,6 млрд рублёў (прырост к 2005 г. – 23,1 %).

Лепшыя паказчыкі па валавым прадукце мелі:

- УП "Унікаштмет" – 6,8 млрд рублёў;
- УП "Канструктарскае бюро спецыяльнай тэхнікі" – 5,1 млрд рублёў;
- УП "Унітэхпрам" – 4,3 млрд рублёў;
- УП "Камбінат грамадскага харчавання" – 3,6 млрд рублёў;
- РУП "ИНКОС" – 2,6 млрд рублёў.

Прыбытак ад рэалізацыі тавараў, прадукцыі і паслуг склаў 3,5 млрд рублёў (прырост к 2005 г. – 47, 2 %). Чысты прыбытак склаў 2,6 млрд рублёў. Рэнтабельнасць прадукцыі ў сярэднім па гаспадарча-разліковых арганізацыях склала 13,4 % (2005 г. – 12,5 %).

Па выніках 2006 г. дэбіторская запазычанасць па прадпрыемствах комплексу БДУ склала 11,2 млрд рублёў, крэдыторская – 7,6 млрд рублёў (прырост к 2005 г. – 8,8 %).

У справаздачным годзе не забяспечылі рэнтабельную працу і дапусцілі страты: РУП "Адамас БДУ" і УП "Уніхімпрам БДУ".

### КАПІТАЛЬНАЕ БУДАЎНІЦТВА

У 2006 г. засвоена капітальных укладанняў па аб'ектах будаўніцтва на агульную суму 14,4 млрд рублёў, у тым ліку:

- ВЛК факультэт міжнародных адносін – 4,9 млрд рублёў;
- навукова-вучэбна-даследчы комплекс па вул. Кальварыйскай, 9 – 7,8 млрд рублёў;
- кацельня САК "Брыганціна" – 1,7 млрд рублёў;
- рэканструкцыя галоўнага корпуса па прасп. Незалежнасці – 16,6 млрд рублёў.

Дзяржаўнай інвестыцыйнай праграмай на 2007 г. ліміты капітальных укладанняў за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту па аб'екце "Навукова-вучэбна-даследчы комплекс па вул. Кальварыйскай, 9" планууюцца ў памеры19,9 млрд рублёў з увядзеннем у эксплуатацыю ў снежні 2007 г.

КОНКУРСЫ

# МАЛАДЗЁЖНЫЯ ГРАНІ КІНО

***25–26 красавіка ў Мінску ўпершыню прайшоў адкрыты гарадскі маладзёжны фестываль відэаролікаў "Кінагрань", арганізатарамі якога выступілі Студгарадок БДУ і аддзел па справах моладзі Мінгарвыканкама.***

Конкурс праходзіў у два этапы. Свае работы прадставілі каля ста студэнтаў сталічных і рэгіянальных ВНУ, навучэнцаў мінскіх сярэдніх школ, а таксама незалежных маладых рэжысёраў. У фінал фестывалю было адабрана 50 найлепшых фільмаў. Гэтыя ролікі на працягу двух дзён гасцінна дэманстраваў усім жадаючым кінатэатр "Цэнтральны". Самі ўдзельнікі, акрамя прагляду сваіх твораў на вялікім экране, наведалі майстар-класы па рэжысуры і аператарскім майстэрстве, завіталі з экскурсіямі ў Белтэлерадыёкампанію і Музей гісторыі беларускага кіно, сустрэліся з рэжысёрам Віктарам Аслюком і, канешне, знаёміліся, гамянілі, абменьваліся вопытам з калегамі па любімай справе.

"Гран-пры" і вялікі шкляны куб – сімвал "Кінаграні" – заняла відэастудыя "SVS" за фільм "Распавядзі мне, воблака". Гэты ролік – гісторыя ў гісторыі: першая аб тым, як у школу прыязджае жанчына з самаробнай лялькай і прапануе дзецям скласці казку з удзелам гэтай выдуманай асобы. Другая – створаная адным з вучняў казка пра смерць хворай на рак дзяўчыны, якую на нябёсах сустракае тая самая лялька. Прадуманае музычнае афармленне, увага да дэталяў (напрыклад – канец роліка: адначасова са смерцю дзяўчынкі канчаецца музыка і гасне свечка) гавораць пра сур'ёзны падыход аўтараў да сваёй работы, а пэўны сацыяльны пафас і выкарыстанне бяспройгрышных, "абкатаных" вобразаў і тэм – пра нацэленасць на перамогу. Нагадаем, што на IV Міжнародным маладзёжным конкурсе відэафільмаў "Славянскае юнацтва: мары і спадзяванні" ў Маскве відэастудыя "SVS" атрымала галоўны прыз за дакументальны фільм "Паэма веры". На "Кінаграні" ўменне нашых студэнтаў рабіць якаснае дакументальнае кіно таксама было адзначана: Андрэй Куціла і яго каманда сталі героямі намінацыі "Найлепшае дакументальнае кіно" за фільм "Блізкае-далёкае". "SVS" можа ганарыцца яшчэ і тым, што работу студыі ацанілі не толькі вядомыя рэжысёры, дзеячы кіно і тэлебачання, якія складалі журы, але і простыя гледачы – фільм "Насустрач каханай" Аляксея Грыгор'ева атрымаў прыз гледацкіх сімпатый.

Такім чынам, студэнцкая відэастудыя "SVS" Студгарадка БДУ заваявала адразу тры прызы на гэтым фестывалі. Але можна шчыра адмесці ўсе падазрэнні ў залішняй сімпатыі арганізатараў да сваіх гадаванцаў, бо далейшае размеркаванне прызоў і ўзнагарод пераканала – спаборніцтва вялося "на роўных", улічваліся толькі прафесіяналізм, арыгінальнасць мыслення і ўменне цікава падаць відэаматэрыял. Так, Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў таксама вынесла з фестывалю некалькі дыпломаў і "малых кінаграняў": у намінацыі "Найлепшае гульнявое кіно" перамог фільм "Лялька" Алены Даніленка, у намінацыі "Сэрца на далоні" – фільм "Жыві" Таццяны Мастыкінай, а фільм "Гульня" Ігара Чышчэні быў узнагароджаны спецыяльным прызам часопіса "На экранах". Фільм "Горад майго спакою" Марыі Курачавай і тэлестудыі сталічнай сярэдняй школы № 4 перамог у намінацыі "Мой Мінск". А стужка "Шчырыя" Алены і Аляксея Рабчанкаў з Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Францыска Скарыны быў прызнаны найлепшым у намінацыі "Student's life". Фільм "Так мовіў Кагі" Аляксея Марозава і Фёдара Нямцова, што прадстаўлялі "Майстэрню Марозава і Нямцова", атрымаў прыз у намінацыі "Найлепшая аператарская работа". У намінацыі "Найлепшая прэзентацыя" ўзнагароджана серыя сюжэтаў Магілёўскага дзяржаўнага універсітэта імя Аркадзя Куляшова (аўтары – Міхаіл і Алег Ганіны). Пераможцам у



*Кіраўнік "SVS" Андрэй Куціла з "Гран-пры" фестывалю*

намінацыі "Кінанастрой" названы фільм "Маленькі Сусьвет", створаны калектывам аўтараў (Т. Яіна, А. Давыдзенка, А. Барысенка). Прадстаўнікі Беларускага нацыянальнага тэхнічнага універсітэта А. Саўчук, А. Пятроўскі, Я. Лукашэвіч і С. Лапухін з фільмам "Пакетаносцы" заваявалі прыз у намінацыі "Найлепшы гумарыстычны відэаролік". У намінацыі "Найлепшы рэпартаж" перамога дасталася фільму "Пакуты па ежы" Вікторыі Стэльмах са студыі "42". Спецыяльны прыз "Эстэтыка ў новым фармаце" атрымаў фільм "Радыёкропка" каманды "КНР" (яе назва складзена з першых літар прозвішчаў аўтараў: Куціла, Налівайка, Рамашка).

Фестываль "Кінагрань" – лаўрэат конкурсу найлепшых маладзёжных праектаў БДУ 2006 года. Хочацца, каб гэта мерапрыемства стала традыцыйным, з кожным годам збірала ўсё болей таленавітых рэжысёраў і спраўдзілася як пляцоўка для эксперыментаў і росквіту айчыннага кінематографа.

**Маргарыта АЛЯШКЕВІЧ**

ДАЛУЧАЙЦЕСЯ!

## "АТРАКЦЫЁНЫ" ФІЗІКІ

Нядаўна ў БДУ прайшлі XXXIII Дні фізіка, мэта якіх – прапагандаванне фізікі як навукі, садзейнічанне аб'яднанню студэнтаў, аспірантаў і маладых вучоных, абмену досведам паміж маладымі фізікамі з Беларусі і розных краін СНД. Прычым, вельмі арыгінальным спосабам – пры дапамозе жартаў і смеху. Ніякіх сур'ёзных чытанняў і канферэнцый! Такія пункты праграмы як "маніпуляцыі з даверлівымі студэнтамі", "святочны зрыў першай пары", "аўкцыён у цёмную", "юсціроўка свядомасці", "каліброўка шклянкі", "спрэчкі з люстрам аб дуалізме", "заманьванне выкладчыкаў" гавораць самі за сябе і адразу настройваюць на вясёлы лад. Самай важнай часткай свята стала Прэс-канферэнцыя з любімымі і вельмі любімымі выкладчыкамі, дзе студэнты маглі задаць пытанні, нават асабістага плана, сваім экзаменатарам. Тэатралізаванае прадстаўленне, наладжанае ў ліцэі БДУ, запомнілася перш за ўсё першакурснікам, якія прайшлі сімвалічнае пасвячэнне ў студэнты пасля здачы першай сесіі. "Капуснік" гасцей прыняў да сябе калегаў з Расіі і Украіны. Вялікую цікавасць у прысутных выклікалі "атракцыёны", што здзівілі сваімі фізічнымі працэсамі.

Такім чынам, фізікі паказалі, што навука, якой яны хочуць авалодаць дасканала, не толькі самая важная і сур'ёзная, але і вельмі захапляльная.

**Ганна ТОЛІНА**

## НА ФЭСТ – У БДУ!

***Названы пераможцы адкрытага конкурсу аўтараў і выканаўцаў паэтычнай песні "ФЭСТ–А–2007", фінал якога прайшоў 19 красавіка ў ліцэі БДУ.***

Лаўрэаты вызначаліся ў трох майстэрнях: "Выканальніцкая" (выканаўцы песень іншых аўтараў), "Паэтычная" (аўтары вершаў) і "Аўтарская" (стваральнікі вершаў і музыкі). Сярод выканаўцаў найлепшым прызнаны студэнт IV курса факультэта журналістыкі БДУ Юрый Кастузік, сярод паэтаў – студэнтка IV курса фізічнага факультэта Юлія Баброва, а ў трэцяй намінацыі вышэйшая ўзнагарода дасталася леташняму выпускніку БДУ Аляксею Мазаніку.

Спецыяльны прыз "Надзея" ўручылі першакурсніцы Інстытута тэалогіі імя святых Мяфодзія і Кірылы БДУ Дар'і Кадомскай. Студэнцкі ансамбль "Зімы не будзе" атрымаў спецыяльны прыз як адзіны ансамбль на фестывалі, студэнт факультэта радыёфізікі і электронікі Дзмітрый Казюбердзін быў ганараваны асаблівым прызам за арыгінальнасць, а "ўлюбёнцам публікі" прызнаны незалежны аўтар-выканаўца Андрэй Бананаў.

У фінал конкурсу было адабрана 30 найбольш прафесійна падрыхтаваных паэтаў, аўтараў песень і выканаўцаў. Усяго ж паступіла болей за 60 заявак з БДУ, Беларускага дзяржаўнага педагагічнага, эканамічнага і аграрна-тэхнічнага універсітэтаў, а таксама прадстаўнікоў сталічных клубаў аўтарскай песні. Журы ацэньвала не толькі музычны слых і вакальныя даныя, але і выбар рэпертуару, артыстычнасць, сцэнічную культуру і якасць інструментальнага суправаджэння.

**Марыя АКУЛІК**

## ВЫСТАВА СТУДЭНЦКАЙ ТВОРЧАСЦІ

На філалагічным факультэце 4–11 мая ў рамках правядзення 64-й навуковай канферэнцыі студэнтаў, магістрантаў і аспірантаў БДУ разгарнулася выстава маладзёжных работ "Творчасць нашых студэнтаў". Яе ініцыятарамі выступілі загадчык кафедры беларускай літаратуры і культуры Таццяна Шамякіна і Ірына Казакова, якая ўзначальвае кабінет-музей беларускай народнай культуры. Мэта выставы – абудзіць імкненне да творчага самавыяўлення студэнтаў, а таксама спрыяць глыбейшаму разуменню імі тэм па прадмеце "Гісторыя і тэорыя сусветнай культуры". Тут былі прадстаўлены работы 28-мі студэнтаў у тэхніцы габелен, акварэль, пастэль, вышыўка, бісерапляценне. Сюжэты ў асноўным адлюстроўвалі мастацтва эпохі неаліту, культуру Егіпта і Месапатаміі. Арыгінальнасцю адрознівалася кампазіцыя з вышывак і аплікацый, выкананая на тканіне зялёнага колеру, упрыгожаная ракавінкамі. Яе аўтары – Галіна Корбут, Ганна Мананкова, Кацярына Нікіціна і Алеся Шавель. Прафесар Т. Шамякіна адзначыла высокую вартасць студэнцкіх работ і ўзгадала Арыстоцеля, па словах якога, далучэнне да сапраўднага мастацтва выклікае катарсіс, ці духоўнае ачышчэнне. Напрыканцы арганізатары падарылі ўсім удзельнікам свае манаграфіі, а таксама кнігі па міфалогіі і сусветнай мастацкай культуры.

**Ганна МЯТЛІЦКАЯ**

У ВОЛЬНЫ ЧАС

# ПРЫГАЖОСЦЬ У СТЫЛІ COMEDY

***Факультэт журналістыкі вядомы сваімі прыгожымі і таленавітымі студэнткамі. Складаная задача паўстала перад журы конкурсу "Міс журфака–2007" – выбраць з гэтага кветніка адну, годную насіць карону.***

Дзевяць найстатнейшых прыгажунь 19 красавіка дэманстравалі не толькі свой знешні выгляд, але і творчы імпэт. Сапраўдная міс павінна мець не проста іскрынку, а "палыхаць агнём". Таму, акрамя традыцыйнага "Дэфіле", дзяўчаты спаборнічалі ва ўменні задаць вострае і арыгінальнае пытанне членам журы ў конкурсе "Інтэрв'ю" і ў творчых здольнасцях ў конкурсе "Крэатыў".

Дзякуючы ўдалым жартам вядучага Яўгена Булкі, выпускніка журфака і вядомага рэзідэнта Comedy Club Minsk Style, у зале панавала атмасфера разняволенасці і яднання студэнтаў з выкладчыкамі. Канкурсанткі таксама не адставалі і ўчынілі такое шоу, якога факультэт яшчэ не бачыў.



*"Міс журфака–2007" Кацярына Адамовіч*

Пасля "цяжкіх" роздумаў журы ўшанавала тытулам "Міс журфака–2007" студэнтку II курса Кацярыну Адамовіч, якая адзначыла, што яшчэ ў мінулым годзе вельмі жадала прыняць удзел у конкурсе, але ён не адбыўся. Цяпер яе мара ажыццявілася. Званнем "Віцэ-міс" была ганаравана Лейла Ісмаілава (дарэчы, карэспандэнтка нашай газеты. – *Рэд.*), якая ў дадатак стала яшчэ і "Міс Фота". "Асалоду, якую я атрымала ад удзелу ў конкурсе, немагчыма параўнаць ні з чым іншым. Спадзяюся, што такія шоу стануць традыцыяй на маім факультэце", – адзначыла дзяўчына. Мілая студэнтка III курса Валерыя Стасюк была аб'яўлена "Міс Усмешкай". А за задзірлівы і незвычайны выступ Настассі Дзядзінкінай тая атрымала званне "Міс Экстравагантнасць".



*"Віцэ-міс" і "Міс Фота" журфака Лейла Ісмаілава*

Дарэчы, у абранні пераможцы вынікі журы і інтэрнэт-галасавання не супалі: паводле апошняга пераможцай стала Дыяна Арыпава (I курс).

**Настасся ЮДЧЫЦ**

**Фота Андрэя НАДТАЧЭЯ**

## БДУ ў СМІ Беларусі

**Інтэрв'ю з рэктарам БДУ прафесарам Васілём Стражавым, а таксама інфармацыя пра шэраг факультэтаў Белдзяржуніверсітэта** – "Народная газета" (04.05).

**Інтэрв'ю з загадчыкам Музея беларускай народнай культуры на філфаку БДУ прафесарам кафедры беларускай літаратуры, доктарам філалагічных навук Ірынай Казаковай** – "Культура" (28.04).

**"Прамая лінія" з удзельнікамі арктычнай экспедыцыі Леанідам Турышавым (БДУ) і Аляксеем Гайдашавым** – "Рэспубліка" (28.04), інтэрв'ю з імі – "Звязда" (04.05).

**"Школа студэнцкага актыву" ў "Брыганціне"** – БелТА (26.04); "Звязда" (04.05).

**Зборы ў Вілейцы для школьнікаў, падрыхтаваныя ФПМІ БДУ** – "Настаўніцкая газета" (24.04).

**Форум маладых упраўленцаў, арганізаваны Інстытутам бізнесу і менеджменту тэхналогій БДУ** – БелТА (23.04).

**Адкрыты маладзёжны фестываль відэаролікаў "Кінагрань", арганізаваны Студгарадком БДУ і аддзелам па справах моладзі Мінгарвыканкама** – БелТА (23.04, 27.04); naviny.by (25.04); "Настаўніцкая газета" (03.05).

**Спаборніцтвы па спартыўным праграмаванні TopCoder і перамога на іх студэнтаў БДУ** – БелТА (23.04, 27.04); tut.by (20.04); "Компьютерные вести» (04.05).

**Уручэнне БДУ ордэна Дружбы народаў В'етнама** – БелТА (21.04, 23.04); БелаПАН (22.04); www.tut.by (22.04); www.naviny.by (22.04).

**Сустрэча замежных выпускнікоў беларускіх ВНУ, якая адбылася ў Белдзяржуніверсітэце** – "Беларусь сегодня" (20.04); "The Minsk Times" (04.05).

**Рэспубліканская алімпіяда па правазнаўстве, у якой перамогу ў камандным заліку, а таксама 2-е і 3-е месцы ў індывідуальным заліку атрымалі студэнты БДУ** – "Звязда" (20.04).

**Адкрыццё Цэнтра рускай філалогіі ў БДУ** – "Народная газета" (19.04); "The Minsk Times" (26.04).

*Пра гэтыя і іншыя падзеі паведамлялася таксама на беларускіх тэле- і радыёканалах.*

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

## ВЕДАЙ НАШЫХ!

Студэнты V курса БДУ Андрэй Куціла і Ірына Пархоменка ганараваныя штогадовай прэміяй Мінгарвыканкама за актыўны ўдзел у грамадскім, культурным і навуковым жыцці сталіцы. Навучэнцаў павіншуюць разам з іншымі 45-цю студэнтамі ВНУ Мінска 30 мая ў гарадской ратушы на пл. Свабоды.

***

Каманда БДУ заваявала па 3 дыпломы І, ІІ і ІІІ ступені, а таксама 5 ухвальных водгукаў на выніках Рэспубліканскай студэнцкай алімпіяды па матэматыцы ў групе А, куды ўваходзяць удзельнікі з класічных педагагічных універсітэтаў.

Яна праходзіла на базе Беларускага дзяржаўнага універсітэта 11–13 мая. Дыпломамі І ступені ганараваныя студэнты факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі Павел Іржаўскі і Руслан Максімаў, а таксама студэнт механіка-матэматычнага факультэта Іван Блізнец.

Усяго ў алімпіядзе ўдзельнічалі 116 чалавек з 26-ці ВНУ рэспублікі (27 каманд).

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

## СТУДЭНЦКІ ІНТАРЭС

# ДОБРЫМ КУРСАМ БРЫГАНЦІНЫ!

***Самыя дзейныя прадстаўнікі студэнцкага самакіравання – члены студэнцкіх саветаў, камандзіры аператыўных атрадаў і іншых службаў 9-ці інтэрнатаў БДУ з'ехаліся 27–29 красавіка ў САК "Брыганціна" на выязны семінар-практыкум "Школа студэнцкага актыву БДУ", арганізаваны Студэнцкім гарадком.***

Моладзь размеркавалася па 6-ці секцыях (для жыллёва-бытавых, прававых, інфармацыйных, культурна-масавых, спартыўных камісій, а таксама для старшынь і сакратароў студэнцкіх саветаў). З актывістамі сустрэліся рэктар БДУ прафесар Васіль Стражаў і дэпутат Палаты прадстаўнікоў, член камісіі па адукацыі, культуры, навукі і навукова-тэхнічным прагрэсе Генадзь Давыдзька. Акрамя таго, для ўдзельнікаў семінара супрацоўнікі псіхалагічнай службы БДУ арганізавалі псіхалагічную гасцёўню, спалучыўшы яе са зборам цацак для аднаго з дзіцячых дамоў.

Працу студэнты чаргавалі з адпачынкам: спявалі ў канцэртнай праграме і танчылі на дыскатэцы, плавалі ў басейне, гулялі ў валейбол і настольны тэніс, а таксама ладзілі камандныя спаборніцтвы. Аднак самыя яркія ўражанні пакінуў, безумоўна, фінал конкурсу "Студэнцкі лідар года".

Дзевяць пераможцаў адборачнага тура (па адным прадстаўніку з кожнага інтэрната) паказалі свае творчыя работы, а затым спаборнічалі ў двух конкурсных заданнях "Самапрэзентацыя" і "Свабодная трыбуна". У выніку лаўрэатамі сталі два лідары – студэнтка ІІ курса эканамічнага факультэта Юлія Хмялеўская з інтэрната № 5 і студэнт IV курса гістарычнага факультэта Тарас Мох з інтэрната № 1. Дарэчы, гэты конкурс праводзіўся ўпершыню, але абяцае стаць традыцыйным.

Распачынаць штогод якую-небудзь традыцыю ў "Брыганціне" – гэта таксама традыцыя. Так семінар з кожным годам становіцца ўсё больш насычаным. Два гады таму ўвялі традыцыю ўрачыстай клятвы, якую прыносяць старшыні студсаветаў, трымаючы ў руках чырвоную стужку. Калі яе разразаюць, кожны атрымоўвае па кавалачку – гэта сімвалізуе сумесную адказнасць студсаветаў усіх інтэрнатаў. Вось яшчэ адна. Кожны студсавет абзавёўся апазнавальнымі знакамі: у адных – гэта майкі, у другіх – заплечнікі, а ў іншых – банданы з сімволікай і нумарам адпаведнага інтэрната. Пасля апошняга семінара было вырашана рэалізаваць праект па стварэнні ў Студгарадку алеі зорак. Яна размесціцца побач з ужо існуючай алеяй дрэў, пасаджаных студсаветам кожнага інтэрната.

У "Брыганціне" сёлета было вельмі цёпла: не таму, што там пабудавалі цеплацэнтр, і нават не таму, што на двары была сапраўдная вясна, а таму што людзі сабраліся маладыя, гарачыя і вельмі энергічныя.

**Людміла ПАЛАВІНКА, Ала МАЧАЛАВА**



*Маладыя, гарачыя і энергічныя – студактыў БДУ на месцы працы і адпачынку*

## ГАРАЧАЯ ЛІНІЯ

***– Чаму закрываецца інтэрнат № 7 па вул. Кастрычніцкай, 10, і куды будуць размеркаваны студэнты, якія зараз там пражываюць?***

Як расказаў дырэктар Студгарадка Міхаіл Чарапеннікаў, за 35 гадоў эксплуатацыі ў інтэрнаце № 7 (узведзены ў 1971 г.) сталіся непрыдатнымі ўсе інжынерныя камунікацыі. Так, капітальнага рамонту патрабуе сістэма водазабеспячэння, ацяплення і электрасеткі. Ацяпляльны сезон 2006–2007 гг. прайшоў без значных праблем толькі дзякуючы мяккай зіме. Абавязкова трэба замяніць ліфты. Да таго ж, гэты інтэрнат з'яўляецца бадай адзіным вышынным будынкам у Мінску, дзе ўсталяваны газавыя пліты, што супярэчыць нормам (патрэбны электрычныя).

Недахопы ў камунікацыях інтэрната і неабходнасць яго капітальнага рамонту зазначаюць і дзяржаўныя службы кантролю: Цэнтр гігіены і эпідэміялогіі і Упраўленне па надзвычайных сітуацыях Мінгарвыканкама.

У сувязі з гэтым у 2005-2006 гг. на замову БДУ была складзена праектна-каштарысная дакументацыя на правядзенне капітальнага рамонту інтэрната, якая абышлася ў 140 млн рублёў. Варта адзначыць, што гэты праект сапраўды толькі на працягу двух гадоў і таму патрабуе сваёй рэалізацыі ўжо сёлета.

Правядзенне капітальнага рамонту інтэрната № 7 унесена ў план фінансавання, і ёсць упэўненасць у поўнай аплаце ўсіх належных работ. Прыкладны кошт капітальнага рамонту інтэрната № 7 БДУ складае 12 млрд рублёў.

Разам з тым са студзеня 2008 г. Беларускі дзяржаўны універсітэт распачне будаўніцтва інтэрната на 1200 месцаў у студэнцкай вёсцы (раён праспекта Дзяржынскага).

Будынак інтэрната № 7 будзе зачынены з 1 верасня 2007 г. Закончыць яго капітальны рамонт плануецца ў 2010 г. Інтэрнат будзе адпавядаць усім сучасным патрабаванням: у кожны пакой будзе падведзены Інтэрнэт, тэлебачанне, цалкам заменены ўсе інжынерныя сеткі, ліфты, пліты, аконныя рамы, дзверы і г. д., на 2-м паверсе будуць абсталяваны спецыяльныя пакоі для інвалідаў.

Насельнікаў інтэрната № 7 (навучэнцы адных з самых буйных факультэтаў БДУ – механіка-матэматычнага і філалагічнага) плануецца рассяліць ва ўсе студэнцкія інтэрнаты універсітэта.

Паколькі высяленне з эксплуатацыі інтэрната № 7 змяншае колькасць месцаў для іншагародніх студэнтаў універсітэта, то было прынята ўзгодненае з факультэтамі рашэнне засяляць студэнтаў V курса ў апошнюю чаргу, акрамя тых, хто мае льготы і асаблівыя поспехі ў навуковым, грамадскім, культурным і спартыўным жыцці. Гэта абумоўлена тым, што студэнты-выпускнікі жывуць у інтэрнаце няпоўны навучальны год: яны выязджаюць на вытворчую і пераддыпломную практыку і, як правіла, раней высяляюцца.

## СУСТРЭЧЫ

# ЗНАЁМСТВА З ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯЙ

***На працягу красавіка ва універсітэце прайшлі сустрэчы студэнтаў з прадстаўнікамі выдавецтва "Беларуская энцыклапедыя", якія былі арганізаваны Фундаментальнай бібліятэкай БДУ, у фондах якой утрымліваецца болей за 150 энцыклапедычных, даведачных і іншых выданняў "БЭ".***

Гэтыя кнігі з'яўляюцца галоўнай каштоўнасцю бібліятэкі і выдаюцца чытачам толькі ў чытальных залах. Падчас сустрэч з супрацоўнікамі выдавецтва, якія спецыялізуюцца па выпуску галіновых выданняў, студэнты розных факультэтаў не толькі пачулі пра гэтыя скарбы, але і пазнаёміліся з імі на разгорнутых выставах.

На іх былі прадстаўлены такія унікальныя выданні, як "Беларуская энцыклапедыя" – першая нацыянальная універсальная энцыклапедыя Рэспублікі Беларусь у 18-ці тамах; "Энцыклапедыя гісторыі Беларусі" – 6-томны даведнік; "Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі" – 5-томны даведнік; "Гарады і вёскі Беларусі" – энцыклапедыя ў 15-ці тамах; "Вялікае Княства Літоўскае" – энцыклапедычнае выданне ў 2-х тамах, якое стала бестселерам, бо ў ім сабрана інфармацыя, якая не мае аналагаў не толькі ў Беларусі, але і ў блізкім замежжы; "Беларускі фальклор" – 2-томнае каляровае выданне; "Спартыўная энцыклапедыя Беларусі"; "Тэатральная Беларусь" – энцыклапедыя ў 2-х тамах" і інш.

Сярод навінак выдавецтва – "Рэспубліка Беларусь" у 6-ці тамах (выдадзена 3), "Старинные усадьбы Берестейщины" і шэраг выданняў серыі "Энцыклапедычная бібліятэка самаадукацыі".

Акрамя таго, студэнтам геаграфічнага факультэта было прэзентавана новае выданне "Блакітны скарб Беларусі", пры стварэнні якога прымалі ўдзел выкладчыкі геафака, у тым ліку дэкан факультэта Іван Пірожнік. Даведнік уключае болей за 3,8 тыс. артыкулаў пра рэкі, азёры, вадасховішчы, вялікія каналы, зоны адпачынку і курорты Беларусі, а таксама шмат каляровых здымкаў, тапаграфічныя карты, карты глыбінь 320-ці найбольш даследаваных азёр Беларусі.

Галоўны рэдактар выдавецтва паэт Генадзь Пашкоў расказаў гісторыю ўзнікнення і развіцця "Беларускай энцыклапедыі", якой у студзені гэтага года споўнілася 40 гадоў.

У свой час выданне ўзначальвалі знакамітыя людзі Беларусі: Іван Шамякін, Мікола Ткачоў, Барыс Сачанка. "Ствараць Энцыклапедыю – гэта пісаць біяграфію свайго народа, справа такая ж пачэсная, як і адказная", – казаў народны паэт Беларусі Пятрусь Броўка, заснавальнік "Беларускай энцыклапедыі", якая сёння носіць яго імя.

**Ірына ШКІРОНАК, вядучы спецыяліст ФБ БДУ**

## СПАБОРНІЦТВЫ

# МЫ – У "ТОПЕ" СВЕТУ!

Абсалютнай пераможцай выхаванцаў факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі БДУ завяршыліся спаборніцтвы па спартыўным праграмаванні TopCoder Open, якія прайшлі 26 красавіка ў Мінску.

Першае месца заняў студэнт IV курса ФПМІ Аляксей Тоўсцікаў. "Срэбра" – у аспіранта ФПМІ Яўгена Ганчара, а трэцяе месца заслужыў вучань сталічнай сярэдняй школы № 41 Дзмітрый Рудоль, якога таксама трэніруюць выкладчыкі БДУ. Заахвочвальны прыз як найлепшаму навічку турніру дастаўся першакурсніку ФПМІ Уладзіміру Скуратовічу.

Усяго ў спаборніцтвах прынялі ўдзел 75 чалавек. Турнір праходзіў у рэжыме on-line адначасова ў БДУ і БДУІР. Удзельнікам неабходна было рашыць тры алгарытмічныя задачы за 70 хвілін, а затым на працягу яшчэ 15-ці хвілін выканаць дадатковыя заданні па пошуку памылак у работах сваіх сапернікаў.

Турнір TopCoder Open з'яўляецца неафіцыйным чэмпіянатам свету па праграмаванні. Яго прэзентацыя ў рамках прома-тура па еўрапейскіх універсітэтах адбылася ў БДУ 25 красавіка. У адпаведных спаборніцтвах штогод прымаюць удзел тысячы праграмістаў з дзесяткаў краін.

Рэйтынг па спартыўным праграмаванні TopCoder прызнаецца да сусветнага. У спісе па краінах (усяго – 51) Беларусь на сёння займае 12-ю пазіцыю. Найлепшы беларускі прадстаўнік – пяцікурснік ФПМІ БДУ Іван Мяцельскі зараз знаходзіцца на 18-м месцы сярод усіх 5202-х удзельнікаў, што ўваходзяць у індывідуальны залік.

**Ганна ТОЛІНА**

## КАНФЕРЭНЦЫІ

# ЗАМЕСТ САМАВАРАЎ... ДЫПЛОМЫ

Сонечным зязннем, усмешкамі знаёмых і сяброў сустрэла дэлегацыю з БДУ Тула, якая стала месцам правядзення Х Міжнароднай студэнцкай навукова-практычнай канферэнцыі "Праблемы моладзі вачыма студэнтаў". Яна адбывалася 24–28 красавіка на базе Тульскага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта імя Л.М.Талстога. Выступы нашых удзельнікаў аказаліся вельмі паспяховымі: Дзмітрый Лебедзь (гістарычны факультэт), Святлана Грыгеліс (механіка-матэматычны факультэт) і Дар'я Прышчэпава (факультэт журналістыкі) вярнуліся з дыпломамі за лепшыя даклады на канферэнцыі. Акрамя таго, беларуская дэлегацыя атрымала ганаровы дыплом за ўдзел у мерапрыемстве.

З усёй адказнасцю мы прадстаўлялі універсітэт разам з нашымі старэйшымі сябрамі, кіраўнікамі ўпраўлення выхаваўчай работы з моладдзю Паўлам Скалабанам і Аляксеем Багамазавым. Сумесна працавалі, глядзелі праз тэлескопы на месяц і зоркі, хадзілі па сцежках Талстога ў Яснай паляне, слухалі музычны спектакль у філармоніі, знаёміліся...

Мы займелі шмат сяброў не толькі ў Туле, але і ў Самары, Архангельску, Цверы, Маскве і іншых гарадах, якія сталі для нас не простымі назвамі, – там таксама жывуць заўзятыя актывісты. З імі абмяняліся досведам. Дазналіся, як арганізоўваецца праца з моладдзю ў іншых універсітэтах. Пазнаёмілі расіян з нашым Студэнцкім інфармацыйным цэнтрам, сайтам "Студэнцкае скрыжаванне" і Цэнтрам занятасці студэнтаў у БДУ. "Намалявалі" структуру маладзёжных арганізацый універсітэта, і пачулі ўхвалу ад прысутных. Даспадобы прыйшліся нашы адносіны да працы і кірункі па інфармаванні студэнтаў. Некаторыя шчыра здзівіліся ініцыятыўнасці і актыўнасці студэнтаў БДУ. Зацікавілі расіян і нумары "Універсітэта", і праграма па накіраванні студэнтаў у летнія атрады. Нас шмат распытвалі. Значыць, мы ўсё робім правільна. Значыць, ёсць да чаго імкнуцца і над чым працаваць. І хаця самавараў мы з Тулы не прывезлі, але ж імя роднай alma mater праславілі. А гэта, згадзіцеся, куды больш значна.

**Дар'я ПРЫШЧЭПАВА**

## АБ'ЯВЫ

**ЮРЫДЫЧНЫ КАЛЕДЖ БДУ**

**аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантнай пасады**

СТАРШАГА ВЫКЛАДЧЫКА кафедры дзяржаўна-прававых і ўгалоўна-прававых дысцыплін.

**Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.**

**Адрас: 220030, г. Мінск, вул. Камсамольская, 21, тэл. 220-29-46.**

## З УСМЕШКАЙ

Чэрціць студэнт на дошцы акружнасць, і яна атрымліваецца ў яго роўнай. Быццам бы цыркулям намалявау. Выкладчык пытаецца:

– Дзе вы навучыліся так малявать акружнасць?

– А я ў войску кухарам быў. Два гады мясарубку круціў.

***

Кіяскёр студэнту каледжа:

– Прыдбайце гэтую кнігу, у ёй вы знойдзеце палову адказаў на хатнія заданні. Студэнт:

– Як цудоўна! Тады дайце мне дзве такія кнігі!

***

Я на лекцыі сяджу, я на лектара гляджу. Чым ён болей загружае, тым я болей тармажу.

УНІВЕРСІТЭТ

Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны універсітэт
Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

Газета зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйнае пасведчанне №149 ад 30 жніўня 2005 года

18 мая 2007 года
Падпісана да друку 16.05.2007 г.
Зак. 519. Тыраж 2000 экз.Ум. друк. арк. 1.
Надрукавана ў РУП "Выдавецкі цэнтр БДУ"
ЛП № 02330/0056850 ад 30.04.2004.
220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6

Рэдактар Сяргей ШАФАЛОВІЧ
Карэктар Юлія ЛІТВІНАВА
Камп'ютарная вёрстка Аляксандра САЛАМАХІНА
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, прасп. Незалежнасці, 4
Прыёмная: вул. Бабруйская, 7, п. 411, тэл. 209-53-45,
e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by